УДК 811.161.3:378

І.У. Капцюг, дац., канд. філал. навук
(ВА РБ, г. Мінск)

# СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ РАЗВІТАГА ЗВАРОТКА Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У беларускай мове звароткі маюць разнастайную структуру: ад неразвітых, якія выражаюцца адной самастойнай часцінай мовы ці ў спалучэнні са службовай, да разгорнутых развітых канструкцый. Структура зваротка цесна звязана са сродкамі яго выражэння.

Развітым называецца зваротак, выражаны дзвюма і болей самастойнымі часцінамі мовы. Такі зваротак дае поўную характарыстыку асобе ці прадмету, ужываецца з мэтай дасягнення большага эфекту ўздзеяння на субяседніка і забяспечвае жаданую танальнасць выказвання.

Развіты зваротак выражаецца спалучэннем назоўніка або прыметніка з прыналежнымі займеннікамі *мой, наш.* Пры далучэнні гэтых займеннікаў экспрэсіўнасць зваротка павышаецца: – *Спіце,* ***мае любенькія****, спіце...* (А. Дудараў. Узлёт). *Вось, пакуль што,* ***мой бядача****, думку дам табе я ў дар…* (Я. Колас. Сымон-музыка). *Што ты часта,* ***маё сэрца****, б’ешся з болем перабоем?* (М. Танк. Што ты часта, маё сэрца...). – *Усё правільна,* ***сябры мае****, аднак апраўдання нам не будзе…* (І. Шамякін. Крыніцы). *Уцякайце ж вы,* ***нашы дзетачкі****…* (Я. Сіпакоў. Адчай). *Я ж не знаю віны, акрамя як адной, што кахаю цябе,* ***мілы мой*** (Н. Гілевіч. Вечаровая песня самотніцы).

Экспрэсіўнасць выказвання ўзмацняецца яшчэ больш, калі адрасант выкарыстоўвае складаны зваротак, які па-рознаму называе адну і тую ж асобу. Так ён выражае свае адносіны да субяседніка або да аб’екта размовы: пачуццё прыхільнасці, сімпатыі, кахання: *І самай раскошнай кветкай з натоўпу ляціць проста ў хлопцава сэрца роднае беларускае слова: –* ***Арол****,* ***Руневіч****! Маладзец,* ***Алесь****!..* (Я. Брыль. Птушкі і гнёзды). *Ах,* ***Беларусь, мая ты доля, мая сляза і пацалунак, маё ў бярозках белых поле, мой песнямі набіты клунак!*** *Нясу цябе праз далі ў далі, спыняюся на землях розных...* (Е. Лось. Ах, Беларусь, мая ты доля...). *Ці не паэт назваў цябе плакучаю,* ***вярба мая****,* ***сястра мая****?* (Н. Мацяш. Вярба). *Сустрэнься ў сне з сабой,* ***мая ласкавая****, з вясной сваёю,* ***любая мая*** (Н. Мацяш. Калыханка маме).

Развіты зваротак выражаецца спалучэннем назоўніка з прыметнікам. Станоўчая характарыстыка адрасата выяўляецца ў далучэнні да неразвітага зваротка прыметнікаў *дарагі, родны, добры, паважаны, шаноўны* і інш.: – *Дык што ж тут мне, скажыце,* ***людзі добрыя****, рабіць?* (Я. Брыль. Два галасы). – ***Дарагія гаспадары****, вам ці не*

*надакучылі госці?* (Р. Барадулін. Запытацца). *Заходзь жа ў хату, **родная дзяўчынка**...* (А. Куляшоў. Хатка). – *Гэта так, **шаноўны Сідар Самсонавіч*** (Я. Янішчыц. Пытанне). *Не трывожся за мой лёс, **спадарожнік шчыры*** (А. Куляшоў. Далёка да акіяна).

Адмоўная характарыстыка выяўляецца пры далучэнні да назоўніка (у адзінкавых выпадках – да субстантываванага прыметніка) прыметнікаў *злы, подлы, халерны, пракляты* і пад.: – *Ах ты, **вар'яце безлітосны**! За што ты лаеш? За што хаеш?* (Я. Колас. Новая зямля). *Дык што ж ты ад веча хочаш зараз, **наш жорсткі князь**?* (Я. Сіпакоў. Веча). – *Ах ты, **подлая твар*** (В. Быкаў. Апошні шанц). – *Зараз ты памрэш страшнай смерцю. Няўжо ты не баішся, **пракляты стары**?* (Там жа). Нельга не згадзіцца з думкай С.Я. Рапацэвіча, які сцвярджае, што прыметнікі ў складзе зваротка "здольны даваць яркую, індывідуальную характарыстыку адрасату мовы, абазначаць такія яго прыметы, якія своеасабліва і ўпершыню раскрываюцца ў дадзеным кантэксце" [1, с. 109].

У шэрагу выпадкаў звароткі разрываюцца іншымі кампанентамі сказа, каб звярнуць большую ўвагу на асобныя часткі зваротка: *Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, **Алеся**, бывай, **смуглявая**, **каханая**, бывай* (А. Куляшоў. Бывай...). *Гэй вы, **смутныя**, гэй вы, **бедныя**, **мае мілыя сябры-згнаннікі**! Ці вы сіраты ў сям'і людской, што глядзяць на вас вокам ворагаў* (Я. Колас. Сябрам-выгнаннікам). *І што ж цябе, **маці**, чакае, **бязмужняя**?* (Я. Купала. Зімою). – *Што, **Цішка**, што, **родны**? Што ты хочаш сказаць?* (І. Шамякін. Трывожнае шчасце).

Развіты зваротак можа выражацца спалучэннем двух назоўнікаў (з прыметнікамі або без іх), дзе залежнае слова стаіць у родным склоне: *Ах, як шчыра з трыбуны "клапоціцеся" пра людзей вы, **абаронцы свабод і гарантый**…* (Н. Гілевіч. Выміраюць плямёны). *За вас, **наступных вякоў унукі**, Прадслава malілася ў галубніцы ва ўзнятай да музыкі неба Сафійцы* (Д. Бічэль-Загнетава. Хто нашу зямельку адновіць...). *Дзе ты, **слова крывічоў высокае**?* (Р. Барадулін. Ў краіне светлай…). *О, мір табе, **шчаслівы дзень яднання**!* (М. Танк. Шчаслівы дзень яднання). *Бачце, што ў свеце робіцца, думайце, **дзеці Зямлі*** (М. Мятліцкі. Урок, якога не было ў Бабчынскай школе).

У якасці развітага зваротка зрэдку выступае спалучэнне двух назоўнікаў з прыназоўнікам (з прыметнікамі або без іх): *Вось жа за гэта перш-наперш і ўдзячны табе я, **краіна з імем прывабным**, **далёкім і блізкім**, як мара аб шчасці: Балгарыя* (Н. Гілевіч. Тваё імя). – ***Дзяўчына з баульчыкам**, вам далёка ехаць?* (А. Васілевіч. Пачакай, затрымайся…). *Што, **Сіміяоне з Полацка**, ты скажаш…* (Н. Мацяш. Маналог Казіміра Лышчынскага).

У склад зваротка можа ўваходзіць неразвіты прыдатак, які з'яўляецца дзейсным сродкам характарыстыкі адрасата. Прыдаткі пры зваротках паказваюць на характэрную прымету, уласцівую пэўнай асобе ці прадмету, яны дапамагаюць лаканічна і вобразна ахарактарызаваць адрасата, даць яму выразную ацэнку, канкрэтызаваць, вылучыць адметную рысу ці адзнаку: – *Засні,* ***мой хлопча-небарача****!* (Я. Колас. Новая зямля). *Ты ў вякоў святая,* ***мова-крывічанка*** (Р. Барадулін. Крывічанка). *Жыві,* ***карміцелька-зямліца****! Радзі! Пладзі! Святкуй жніво!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці). *Тваё лісцё,* ***сястра-дуброва****, зноў забуяе па вясне…* (Там жа). *Не дужа,* ***манашка-каплічка****, чарнейся ў вячэрняй траве* (Р. Барадулін. Не дужа!).

У адзінкавых выпадках у ролі зваротка выступаюць антанімічныя пары слоў: *Эх вы,* ***леты-зімы****! Не ўтаплюся, дык згару я ў зваблівым блакіце* (А. Вялюгін. Нёманская рута).

Беларускай мове характэрны і шматкампанентны развіты зваротак, у які ўваходзяць тры і болей самастойныя часціны мовы. Такі зваротак дае найбольш поўную, усебаковую характарыстыку адрасату, дазваляе выразіць усе адценні пачуццяў да субяседніка: *Дзякуй,* ***брат мой балгарскі Андрэй!*** *Быў ты ўвесь з дабрыні і любові, а любоў на зямлі не памрэ – на зямлі і ў паэтавым слове* (Н. Гілевіч. Памяці Андрэя Германава). ***Старонка лепшая ў штодзённіку жыцця****! Зноў з ціхай радасцю цябе чытаю я* (М. Багдановіч. У вёсцы). *Я, можа б, запярэчыць мог, пераканаць у адваротным, цябе,* ***паэт шляхоў-дарог пакутлівых і беззваротных*** (М. Танк. Гутарка з Т. Бароўскім). *Ах,* ***чароўныя дудачкі з матчынай казкі****! Паўжыцця давялося хадзіць, каб здабыць вас…* (Н. Мацяш. Тры дудкі). *З вясёлым смуткам асыпайся,* ***лісце забранзавелых каляндарных ісцін*** (А. Вялюгін. Дрымотная мільгае ліставея...).

У склад шматкампанентнага развітага зваротка могуць уваходзіць асабовыя займеннікі *ты, вы,* прыналежны займеннік *мой*: *Прайшла,* ***вясна ты маладая****!* (Я. Колас. Новая зямля). *А сам за гандаль я засяду,* ***мае вы родненькія братцы****, – хачу я сальнікам заняцца* (Там жа). – *Цэлыя,* ***браце ты мой****, скрыні стаялі* (Я. Брыль. Нібыта рознае). – *Чаму ж вы не спіцё,* ***начнікі вы гэтакія****?* (І. Шамякін. Крыніцы). *Як там даводзіцца табе,* ***пакутнік ты мой залаты****…* (А. Васілевіч. Пачакай, затрымайся…). Аднак у такіх шматкампанентных зваротках асабовы займеннік можна апусціць: – *У мяне не жаніцьба,* ***даражэнькі мой****, у мяне – замужжа* (І. Шамякін. Вазьму твой боль). – ***Сыночак мой родненькі****…* ***Крывінка мая****!.. Што я раблю?* (І. Шамякін. Палеская мадонна).

Зрэдку зваротак выражаецца цэльнымі сінанімічнымі

спалучэннямі слоў: *А як жа ты, **мая зямля-радзіма**, а дзе твае стовежавыя замкі?* (Е. Лось. Я прачытала, што ў адной краіне...). *Ой, **лясы-бары ды лугі-разлогі**! Цераз вас ідуць пуцінкі-дарогі* (М. Багдановіч. Ой, лясы-бары ды лугі-разлогі!..). *Эх, **лета-лецейка любое**, ты адцвітаеш, **залатое**!..* (Я. Колас. Новая зямля).

Шматкампанентны развіты зваротак можа ўключаць у свой склад дзеепрыметныя звароты, параўнальныя канструкцыі, развітыя прыдаткі, даданыя часткі сказа. Такія звароткі ўжываюцца пераважна ў мове паэтычных твораў і сведчаць аб высокім майстэрстве аўтара: *Гэй ты, гэй, **Беларусь, маладая старонка, што гібела сталецці ў бяспуцці, ў пацёмках**, – гэй, скажы, скуль цяперашня слава твая?* (Я. Купала. Маладая Беларусь). *Што ж маўчыш ты, **гусляр, ніў, лясоў песнябай, славай хат маіх подданых слаўны**?!* (Я. Купала. Курган). *Столькі год на падбор словы плавіць гарачая кроў, каб я змог у любві найвялікшай прызнацца табе, **Беларусь – мая маці і мова, паветра і хлеб**!* (А. Вялюгін. Прызнанне ў любові). *Ды я душою ажываю, як вокам мыслі азіраю цябе, **мой луг і бераг родны, дзе льецца Нёман срэбраводны, дубы дзе дружнай чарадою стаяць, як вежы, над вадою даўнейшых спраў вартаўнікамі і ззяюць грозна жараламі*** (Я. Колас. Новая зямля).

Такім чынам, ужыванне ў творах мастацкай літаратуры развітага зваротка абумоўлена імкненнем аўтара даць трапную і вобразную характарыстыку адрасату. Двухкампанентны развіты зваротак уключае ў свой склад дзве самастойныя часціны мовы і выражаецца наступнымі сродкамі: спалучэннем назоўніка або прыметніка з прыналежнымі займеннікамі мой, наш, спалучэннем назоўніка з прыметнікам, спалучэннем двух назоўнікаў з прыназоўнікам або без яго, назоўнікам з неразвітым прыдаткам. Шматкампанентны развіты зваротак уключае ў свой склад тры і болей самастойныя часціны мовы, можа быць ускладнены дзеепрыметнымі зваротамі, развітымі прыдаткамі, параўнальнымі канструкцыямі, даданымі часткамі сказа, сінанімічнымі спалучэннямі слоў. Шматкампанентны развіты зваротак пашыраны ў творах мастацкай літаратуры, пераважна ў паэзіі. Кожны такі зваротак з’яўляецца па-свойму адметным і ўваходзіць у скарбніцу беларускай літаратурнай мовы.

ЛІТАРАТУРА

1. Рапацэвіч, С. Я. Зваротак у паэтычнай мове / С. Я. Рапацэвіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2002. – № 3. – С. 108–110.